**7 красавіка 2025 г. – 225 гадоў з дня нараджэння Келясціна Іванавіча Брэна (1800-1875), беларускага краязнаўца, фалькларыста, этнографа, які некалькі год служыў святаром у Кобрыне**



Келясцін Іванавіч Брэн нарадзіўся 7 красавіка 1800 года на Брэстчыне. З сям'і чыншавых дзяржаўных сялян. У розных крыніцах годам нараджэння К. І. Брэна называюцца таксама 1799 год і 1802 год. Закончыў Брэсцкае шасцікласнае вучылішча, дзе пасля два гады працаваў выхавацелем. У канцы 1820-х гадоў вучыўся і працаваў пісьмаводам у Жыровіцкай духоўнай грэка-уніяцкай семінарыі, якую закончыў у 1831 годзе.

З 1831 года Келясцін Брэн служыў святаром у Кобрыне, атрымаў парафію Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Кобрыне.

З 14 кастрычніка 1838 года - настаяцель царквы св. Мікалая ў в. Стары Корнін Бельскага павета Гродзенскай губерні. З 30 красавіка 1839 года - праваслаўны. Пасля прыняцця праваслаўя сустрэў варожыя адносіны да сябе з боку мясцовага насельніцтва і быў вымушаны перамяшчацца пад аховай тысяцкага.

Свяшчэннік К. І. Брэн быў этнографам і фалькларыстам, збіраў матэрыялы пра абрады, народныя гульні і забавы. Ён адзначаў некаторую архаічнасць у беларускім фальклоры, што дало магчымасць лічыць беларускую народную творчасць адной з самых старажытных у славянскім рэгіёне. Стварыў першае этнаграфічнае апісанне беларускай вёскі на Падляшшы.

Асноўная праца Келясціна Брэна – «Мясцовае этнаграфічнае апісанне Бельскага павета Гродзенскай губерні…» (напісана ў 1856 г.), якая прысвечана матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага насельніцтва на тэрыторыі Падляшша (цяпер Беласточчына). Складаецца з шасці раздзелаў: «Вонкавы выгляд», «Мова», «Хатні побыт», «Асаблівасці грамадскага быту», «Разумовыя здольнасці, маральныя якасці і адукацыя», «Народныя паданні і помнікі». У раздзеле «Хатні побыт» прадстаўлена штодзённае жыццё селяніна, адзенне, прылады працы, звычаі і абрады, дзіцячыя гульні, хваробы людзей і спосабы іх лячэння. Раздзел

«Народныя паданні і помнікі» змяшчае і фальклорны матэрыял.

У працы К. І. Брэна 38 народных песень, у тым ліку 14 вясельных з апісаннем вясельных абрадаў, 24 загадкі, 15 прымавак, 2 казкі, дадзена параўнальнае апісанне побыту беларусаў і мазураў. Вясельныя песні пададзены ў адпаведнасці з апісаннем вясельных абрадаў, іншы фальклорны матэрыял змешчаны ў дадатку. Да працы прыкладзены малюнкі адзення, рыбалоўных прылад, планы жылых і гаспадарчых пабудоў. Аўтар параўноўвае беларусаў з палякамі (мазурамі), паказвае іх знешні выгляд, хатні побыт, разумовыя здольнасці, маральныя якасці і інш., падкрэслівае аднолькавае і адметнае адрознае ў іх культурах, вераваннях, фальклоры.

Рукапіс захоўваецца ў архіве Геаграфічнага таварыства Расійскай Федэрацыі ў Санкт-Пецярбургу. Фальклорныя запісы К. І. Брэна ўвайшлі ў кнігі серыі «Беларуская народная творчасць»: «Вяселле. Песні» (кн. 2, 1981); кн. 4–6 (1985–1988), «Гульні, забавы, ігрышчы» (2003).

Келясцін Іванавіч Брэн памёр 29 сакавіка 1875 года, пахаваны пры царкве ў Старым Корніне.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

## Працы

**Бренн, К. И.** Местное этнографическое описание Бельского уезда / Келестин Иванов Бренн // Бельскі гостінэць. - № 1. - Бельск-Падляскі, 2017. - С. 13-51.

**Вяселле** ў Бельскім павеце /на падставе рукапісу К. І. Брэна з 1853 г. ; апрацаваў Мікалай Лобач // Беларускі каляндар. 1982. - Беласток, 1982. - С. 163-174.

**Бренн Келестин.** Из путевых заметок старого священника / Келестин Бренн // Литовские епархиальные ведомости. - 1864. - № 24. - С. 951-958.

## Аб жыцці і дзейнасці К. І. Брэна

**Лобач, М. С.** Брэн Келясцін Іванавіч / М. С. Лобач // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1996. – Т. 2. – С. 283.

**Брен Келестин Иванович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. – Т. 2. – С. 498.

**Брен Келестин Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 122-123.

**Брэн Келясцін Іванавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2011. — Т. 2. — С. 49.

**Лобач, М. С.** Брэн Келясцін Іванавіч / М. С. Лобач // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 1989. – С. 90.

**Саламевіч, У. І.** Брэн Келясцін Іванавіч / У. І. Саламевіч // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. - Мінск, 2005. - Т. 1. – С. 190-191.

**Лобач, М. С.** Брэн Келясцін Іванавіч / М. С. Лобач // Асветнікі зямлі Беларускай, X - пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 2010. - С. 65.

**Лобач, М.** Келясцін Брэн. Па слядах рукапіснага этнаграфічнага апісання Бельскага павету свяшчэнніка Келясціна Брэна з 50-х гадоў XIX ст. / М. Лобач // Беларускі каляндар 1986. - Беласток, 1986. - С. 69-90.

**Брэн Келясцін Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын, 2020. – С. 14-15 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**225 гадоў** з дня нараджэння Келясціна Іванавіча Брэна (1800-1875) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 162.

**Doroteusz, F.** Dziela duchownych ze Starego Kornina fundamenty naszej tożsamości / Fionik Doroteusz // Бельскі гостінэць. - № 1. - Бельск-Падляскі, 2017. - С. 3-12.

Бренн К. И. - краевед, этнограф, фольклорист, в 1831 г. служил священником в Кобрине.

**7 красавіка 1800 г.** [нар. К. І. Брэн] : Даты. Падзеі. Людзі // Звязда. - 2016. - 7 красавіка. – С. 16.

У гэты дзень нарадзіўся К. І. Брэн, беларускі краязнаўца, фальклярыст, этнограф, які некалькі год служыў святаром у

Кобрыне.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Імёны:***

Брэн Келясцін Іванавіч

***Прадметы:***

Свяшчэннікі

Этнографы

Фалькларысты